УДК 738.8

# КЕРАМІЧНЫЯ ВЫРАБЫ, ЯК РЭЧЫ МАСТАЦТВА І СРОДАК АДЛЮСТРАВАННЯ ГІСТОРЫІ РУХУ МОЛАДЗІ Ў КАНЦЫ XX СТ.

**Таранда М.І., Дуброўскі В.В.**
УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт",
г.Гродна, Рэспубліка Беларусь

Кераміка (грэч. keramos – гліна), вырабы з прыродных глін і іх сумесей з мінеральнымі і арганічнымі дамешкамі. Паводле прызначэння кераміка падзяляецца на посуд, будаўнічыя вырабы і рэчы мастацтва або культу.

На тэрыторыі Беларусі вытворчасць глінянага посуду пачалася з канца V-га тысячагоддзя да н.э. [1,163]. У XI-XII стагоддзях у гарадах Беларусі (Пінск, Гродна) з'яўляюцца керамічныя пліткі, якімі аздаблялася падлога мураваных храмаў [2,123], а з XIII ст. з'яўляюцца высокамастацкія керамічныя вырабы ў выглядзе кафлі, якая служыла канструкцыйным і дэкаратыўным элементам сценак печаў і каміноў, прымянялася для абліцоўкі сцен у манументальных пабудовах. У XV ст. на кафлі з'яўляюцца прыгожыя рэльефныя узоры, выявы чалавека [2,267]. У XVI-XVII ст. росквіт вытворчасці паліхромнай кафлі на Беларусі дазволіў экспартаваць яе ў Маскоўскую дзяржаву. Вывезеныя з Беларусі майстры керамічнай справы ўпрыгожвалі кафлямі маскоўскія і падмаскоўныя храмы, харомы, церамы і манастыры, наладзілі выраб кафлі пры Іверскім манастыры на Валдаі, зрабілі значны ўклад у вытворчасць архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі ў Расіі [1,164].

Але прапусцім далейшую гісторыю развіцця керамічнай справы ў Беларусі і разгледзім выпуск сувенірных мастацкіх керамічных медалек у Беларусі ў 90-х гадах XX ст.




Гродна. 12 сакавіка 1986 года пры гарадскім доме культуры быў створаны клуб аматараў гісторыі і культуры роднага краю "Паходня". Адразу ж з'явілася неабходнасць мець нейкі сімвал арганізацыі і мастак Алесь Ступень робіць металічную выяву паходні - "факел" з адпаведным надпісам "Паходня". Адначасова мастак-рэстаўратар Уладзімір Кіслы прапануе керамічную медальку з выявай Гродзенскага старога замку і з надпісам "Гродна" (дыяметр яе ўсяго 22 мм). У хуткім часе мастак дапрацаваў яе



РЭПОЗІТОРЫЙ ГГАУ

і па перыметру з’явілася дадатковая гліняная палоска з надпісам “Клуб ·Паходня·” Медалькі набывалі сябры клуба, а таксама яны ахвяраваліся для запрошаных гасцей, ці вельмі паважаных асобаў, з якімі даводзілася кантактаваць. Адна медалька была прычэплена да помніка М.Багдановіча ў Ялце, дзе правісела даволі працяглы час, другая, пазней, аж у 1988 годзе, пад час  удзелу дэлегацыі з Гродна ў адкрыцці помніка паэту А.Гаруну, была пакінута на магіле іншага беларуска-польскага паэта А.Міцкевіча ў Кракаве, а 31.05.1987 падчас выступленія старшыні “Паходні” на калегіі Міністэрства культуры была ахвяравана міністру культуры Беларусі.



Адначасова У.Кіслым былі зроблены вельмі цікавыя медалькі, маючыя проста сувенірнае значэнне: копія пячаці Князя Вітаўта, Гродзенская гарадская пячатка паводле 1540 г. з выяваю аленя сьвятога Губерта, шчыт з выяваю “Пагоні”. На апошняй няма кляйма мастака, але яна была ў той час, калі мала хто ведаў увогуле пра старажытны герб “Пагоня”, добрым сувенірам, які быў нават ахвяраваны ў 1986 годзе  знакамітаму беларускаму гісторыку Мікалаю Улашчыку з Масквы. Была выпушчана медалька з надпісам “Музей атэізму. Гродна”. Нягледзячы на такую назву музей шмат зрабіў для збору і захавання  старажытных каштоўнасцей на тэрыторыі ўсёй Беларусі, для захавання і рэстаўрацыі муроў кляштара і царквы, пабудаваных у XVII  ст. уніяцкім ордэнам базыліянаў.

21.12.1986 у актавай зале медінстытута адбывалася навуковая канферэнцыя “Гісторыя матэрыялізму і медыцына ў Беларусі”, якая прысвячалася 400-годдзю першага анатамічнага ўскрыцця цела караля Стэфана Баторыя. Да канферэнцыі была выпушчана керамічная медалька з выявай чалавечага сэрца на фоне аднаго з Гродзенскіх палацаў і з надпісам “ПЕРШАЕ АНАТАМІРАВАННЕ НА ТЭРЫТОРЫІ КРАІНЫ. ГРОДНА 1986 г.”, якая мела 55 мм у дыяметры (гл.вышэй).




Да першага рок-фестывалю ў Гродна была выпушчана медалька  з надпісам на рускай мове  “∗ДНИ ПОПУЛЯРНОЙ МОЛОДЕЖНОЙ МУЗЫКИ∗СЕНТЯБРЬ·1987 г. МОЛОДЕЖНЫЙ ЦЕНТР· ГРОДНО”

РЕПОЗИТОРИЙ ГрГУ

16.10.1987 г. пад Мінскам у Ракаве адбылася нарада беларускіх маладзёжных суполак, на якой прысутнічалі госці практычна з усіх бліжэйшых рэспублік СССР. Моладзь на паседжанні секцый абмеркавала самыя розныя пытанні: культуры, гісторыі, палітыкі і г.д. Крыху пазней распрацаваныя пытанні былі даведзены да ўсіх і прыняты для выканання. Для удзельнікаў нарады выдаваліся медалькі вялікага памеру да 90 мм у дыяметры. На іх сноп збожжа і надпіс “ВАЛЬНАЯ СУСТРЭЧА БЕЛАРУСКІХ СУПОЛАК • ТАК СЕЙЦЕ Ж, ДЗЕЦЮКІ ПОЎНАЮ РУКОЮ • МЕНСК·87”.




18-19.12.1987 г. ва Універсітэце імя Я.Купалы адбылася канферэнцыя, якая прысвячалася 300-годдзю Фарнай аптэкі ў Гродна. Да гэтай падзеі У.Кіслым была выпушчана медалька авальнай формы 55х70 мм з выявай будынка аптэкі і надпісам “ПЕРШАЙ ГРОДЗЕНСКАЙ АПТЭЦЫ 300 год”. Але была і іншая медалька з надпісам “ПЕРШАЙ АПТЭЦЫ г.ГРОДНА 300 (1687-1987)”




Чарговая медалька напамінае аб маладзёжнай акцыі пратэсту супраць будаўніцтва гідраэлектрастанцыі ў Даўгапілсе. Будаўніцтва ГЭС на Дзвіне ішло поўным ходам і пагражала затапленню 97 гарадскіх пасёлкаў і вёсак на тэрыторыі Беларусі. Тагачаснае кіраўніцтва рэспублікі праблема чамусці не цікавіла. Інтэлігенцыяй і моладдзю Беларусі ішоў збор подпісаў пад лістамі пратэсту ў Савет Міністраў, тады яшчэ, СССР. У Гродна было сабрана і адпраўлена крыху больш за 400 подпісаў. З 30.04 да 2.05.1987 года адбылося сумеснае воднае ралі па Дзвіне беларускай і латышскай моладзі з удзелам полацкага рок-гурта “Рокаш” і мінскай “Мроі”, якія пасля гэтага згубілі месца для рэпетыцый. Для ўдзельнікаў акцыі пратэсту была падрыхтавана медалька, якая мела дыяметр 80 мм. Надпісы на ёй былі ў двух мовах: беларускай і латышскай “УРАТУЙМА! PALIDZESIM! ДЗЬВІНА DAUGAVA 1987”. У 1989 г. будаўніцтва ГЭС было спынена.




РЕПОЗИТОРИЙ ГрГУ

Памяткай аб удзеле ў водным раллі па Прыпяці 13-15.05.1988 г. з'яўляецца медалька, якая мае 55 мм у дыяметры і на якой на фоне рэчкі, якую нагадвае гадзюка з каронай на галаве, напісана "КРАІНА ПАЛЕСЬСЕ'88". Раллі праводзілася маладзёжнымі суполкамі Беларусі і было скіравана супраць далейшага асушэння Палесся, як небяспечнага для экалогіі краіны. Медалька не паліраваная і мае светлы колер натуральнай гліны.




15.10.1988 г. у памяшканні Гродзенскага тэатра лялек святкавалі 100-годдзе мастака, навукоўца Я.Драздовіча. Да юбілею была выпушчана керамічная медаль з барэльефам мастака і надпісам "Язэп Драздовіч 1888-1988".




Восенню 1988 года ў Беларусі ўпершыню шматлюдна святкавалі "Дзяды". Памятная медалька да гэтай падзеі 60х80 мм зроблена ў выглядзе запаленай знічкі, на абрусе з грубатканай тканіны.



30.04-2.05.1990 года адбылася антыракетная вандроўка беларускай моладзі па Навагрудскаму, Дзятлаўскаму і Лідскаму раёнах, якая была скіравана супраць дальнейшага знаходжання на тэрыторыі Беларусі ракетных баз. Удзельнікі яе мелі магчымасць павесіць сабе на грудзі медальку ў форме сэрца, на якой выява вершніка са шчытом з пацыфісцкім знакам, а ў правай руцэ вершніка галінка ружы. Змест надпісу "ЛІДА'90".




Да 150-годдзя са дня нараджэння Ф.Багушэвіча, якое адзначалася ў Гродна, У.Кіслым была зроблена юбілейная медалька з барэльефам і надпісам "НЕ ПАКІДАЙЦЕ Ж МОВЫ НАШАЙ БЕЛАРУСКАЙ... ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ 1840-1990".




Медаль амаль прамавугольнай формы 90-100 мм з надпісам "БЕЛАРУСКІ ПЕРШАДРУКАР Ф.СКАРЫНА 1490-1990". Яна была зроблена да навуковай канферэнцыі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

гісторыкаў медыцыны, прысвечанай 500-гадоваму юбілею Скарыны, якая прайходзіла ў Гродна 20 і 21 верасня 1990 г.

17.11.1990 г. у Вільні адбылося ўрачыстае адкрыццё шыльды, прысвечанай 500-м угодкам Ф.Скарыны. Прысутным на свяце арганізатары ахвяравалі медалькі (дакладныя паменшаныя копіі) мемарыяльнага знака. Яны мелі ў дыяметры 72 мм, барэльеф першадрукара, выяву вежы Гедыміна і надпіс “Ф.СКАРЫНА ♦ 500”.




Такім чынам, маючы калекцыю керамічных медалей, ёсць магчымасць прыпомніць і адпаведныя даты, звязаныя з іх выпускам. Тут мы прадставілі толькі частку керамічных вырабаў, якія з’явіліся на працягу 5 гадоў нашай нядаўняй гісторыі. Пры гэтым не ішла размова аб медальках, якія прысвячаліся пэўным архітэктурным помнікам. Таму, трэба звярнуць увагу на працяг такой традыцыі і ў сучасны момант. Няхай гэта будзе нейкае шоу першакурснікаў, праца ў будаўнічых атрадах, выпускны, чарговы юбілей універа. Галоўнае каб зробленыя медалькі былі сімвалічнымі і высокамастацкімі.

Літаратура:

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. -Т.4, С.163-164.
2. Гісторыя беларускага мастацтва: У 6-ці т. -Т.1. – Мн.:Навука і тэхніка, 1987. – 304 с.

**Резюме**

Представлены несколько керамических медалей, изготовленных художниками в 1986-1990 годах и показана их связь с конкретными событиями.

**Summary**

The ceramic medals made by artists in 1986-1990 are submitted some and their connection with concrete events is shown.

РЕПОЗИТОРИЙ